Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2024;3:62–66
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2024;3:62–66

УДК 001.89:378.4

# НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКАЯ РАБОТА КАФЕДРЫ БЕЛОРУССКОГО ЯЗЫКОЗНАНИЯ

***Г. К. ЧЕХОВСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Рассматривается научная деятельность кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета. Основное внимание обращается на разработку двух научных тем, связанных с изучением истории белорусского языка и его современного состояния, а также на сотрудничество с ведущими отечественными и зарубежными научными учреждениями. Излагается видение цели и перспективных направлений деятельности кафедры.

***Ключевые слова:*** кафедра белорусского языкознания; научная работа; современный белорусский язык; история белорусского языка.

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА

***Г. К. ЧАХОЎСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Разглядаецца навуковая дзейнасць кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Асноўная ўвага звяртаецца на распрацоўку дзвюх навуковых тэм, звязаных з вывучэннем гісторыі беларускай мовы і яе сучаснага стану, а таксама на супрацоўніцтва з вядучымі айчыннымі і замежнымі навуковымі ўстановамі. Выкладаецца бачанне мэты і перспектыўных напрамкаў дзейнасці кафедры.

***Ключавыя словы:*** кафедра беларускага мовазнаўства; навуковая работа; сучасная беларуская мова; гісторыя беларускай мовы.

# RESEARCH WORK OF THE DEPARTMENT OF BELARUSIAN LINGUISTICS

***G. K. CHAHOUSKI***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The scientific activity of the department of Belarusian linguistics of the faculty of philology of the Belarusian State University is considered. The main attention is paid to the development of two scientific topics related to the study

**Образец цитирования:**
Чахоўскі ГК. Навукова-даследчая работа кафедры беларускага мовазнаўства. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2024;3:62–66.
EDN: EVVSQX

**For citation:**
Chahouski GK. Research work of the department of Belarusian linguistics. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2024;3:62–66. Belarusian.
EDN: EVVSQX

**Автор:**
***Георгий Константинович Чеховский*** – кандидат филологических наук, доцент; заведующий кафедрой белорусского языкознания филологического факультета.

**Author:**
***Georgy K. Chahouski***, PhD (philology), docent; head of the department of Belarusian linguistics, faculty of philology.
*chekhovskygk@bsu.by*
*https://orcid.org/0000-0002-2756-0847*

of the history of the Belarusian language and its current state, cooperation with leading domestic and foreign scientific institutions. The vision of the purpose and promising areas of activity of the department is outlined.

***Keywords:*** department of Belarusian linguistics; scientific work; modern Belarusian language; history of the Belarusian language.

## Уводзіны

Прынцыпы навукова-педагагічнай дзейнасці кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта вядуць пачатак ад традыцый выкладання беларускай мовы, якія фарміраваліся з моманту заснавання ўніверсітэта. Адным з першых спецыялістаў па беларускай мове і методыцы яе выкладання (1923–1926) быў выдатны педагог, класік беларускай літаратуры Якуб Колас.

З 1943 па 1956 г. мовазнаўчая падрыхтоўка праводзілася ў межах кафедры беларускай мовы і літаратуры, якой загадваў дацэнт М. Р. Ларчанка. У гэты час у складзе кафедры пачала сваю навукова-педагагічную дзейнасць старшы выкладчык М. А. Жыдовіч, якая пазней стала доктарам філалагічных навук.

У 1956 г. як самастойная адзінка аформілася кафедра беларускай мовы, яе ўзначаліў былы франтавік дацэнт М. І. Жыркевіч. У 1967 г. на гэтай пасадзе яго змяніў доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Л. М. Шакун, які загадваў кафедрай да 1992 г.

У 1993 г. адбылася рэарганізацыя кафедры беларускай мовы, у выніку чаго як самастойныя навукова-педагагічныя падраздзяленні сталі дзейнічаць кафедра сучаснай беларускай мовы і кафедра гісторыі беларускай мовы. Першую кафедру ў розныя гады ўзначальвалі прафесар Л. І. Бурак (1993–1996), дацэнт Л. І. Сямешка (1997–1999), прафесар А. Я. Міхневіч (2000–2001), дацэнт З. І. Бадзевіч (2002–2019). На чале другой кафедры знаходзіўся прафесар М. Р. Прыгодзіч (1993–2019). У 2019 г. кафедра сучаснай беларускай мовы і кафедра гісторыі беларускай мовы былі аб'яднаны ў кафедру беларускага мовазнаўства.

З красавіка 2019 г. па снежань 2020 г. наваствораная кафедра працавала над навукова-даследчымі тэмамі «Лексіка-семантычны, структурна-граматычны і камунікатыўны аспекты даследавання сучаснай беларускай мовы» (№ дзярж. рэгістрацыі 20162482) і «Структура і функцыі беларускай мовы ў ХХ стагоддзі: сінхронны і дыяхронны аспекты» (№ дзярж. рэгістрацыі 20162480) на 2016–2020 гг. У 2021–2025 гг. кафедра выконвае тэму «Беларуская мова на розных этапах яе гістарычнага развіцця: структурна-граматычны, семантыка-стылістычны і нарматыўна-камунікатыўны аспекты» (№ дзярж. рэгістрацыі 20212927).

## Вынікі і іх абмеркаванне

Істотным дасягненнем кафедры стала абарона доктарскай дысертацыі Г. І. Кулеш «Фарміраванне і развіццё мовы беларускага заканадаўства ХХ – пачатку ХХІ ст. (на матэрыяле беларускамоўных заканадаўчых тэкстаў)» (Мінск, 2016). Вынікі даследавання маюць важнае значэнне для распрацоўкі тэарэтычных асноў функцыянальнай стылістыкі беларускай літаратурнай мовы і пытанняў літаратурнай нормы, даюць магчымасць сфармуляваць навукова абгрунтаваныя патрабаванні да мовы заканадаўчых актаў і вырашыць праблему перыядызацыі гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Напрацоўкі Г. І. Кулеш выкарыстоўваюцца Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь пры падрыхтоўцы беларускамоўнай часткі базы даных «Слоўнік юрыдычных тэрмінаў на беларускай, рускай і англійскай мовах», у метадычнай рабоце па паляпшэнні якасці прававых актаў, якую цэнтр праводзіць з дзяржаўнымі органамі.

Кафедра ажыццяўляе навукова-даследчую работу ў каардынацыі з Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Так, М. Р. Прыгодзіч выступаў з паведамленнямі на круглым стале «Беларуская навуковая тэрміналогія: гісторыя і сучаснасць», які праходзіў у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі 26 кастрычніка 2021 г., а таксама на круглым стале «Беларускія пераклады Бібліі», што адбыўся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 1 снежня 2021 г. У розных мерапрыемствах Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі прымалі ўдзел прафесар Г. І. Кулеш, дацэнты С. М. Запрудскі, Г. К. Ціванова, М. І. Свістунова, С. М. Якуба, Г. К. Чахоўскі, Т. Л. Чахоўская.

Упершыню ў беларусістыцы супрацоўнікі кафедры падрыхтавалі пераклад Псалтыра на сучасную беларускую літаратурную мову[1] згодна з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 420-З «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», уведзенага ў дзеянне 1 верасня 2010 г. Выданне адрасавана вернікам розных канфесій і рэлігійных плыняў, святарам, навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй рэлігіі і царквы Беларусі. Гэты праект з'яўляецца важным крокам

[1]Псалтыр : юбіл. выд. памяці Францыска Скарыны, 500-годдзю выд. яго першай друкав. кн. Бібліі на беларус. мове, 6 жн., 1517–2017 / склад.: У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. М. Завальнюка. Мінск : Рым.-катал. прыход св. Сымона і св. Алены : БДУ, 2018. 395 с.

да яднання перакладчыцкіх калектываў для выпрацоўкі і выкарыстання ў хрысціянскім набажэнстве адзіных лексічных, правапісных і марфалагічных норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Акрамя таго, у практыку выкладання філалагічных дысцыплін упершыню быў уключаны вучэбны дапаможнік Г. І. Кулеш, М. Р. Прыгодзіча, С. М. Запрудскага, М. І. Свістуновай «Лексікалогія беларускай мовы ў даследаваннях і каментарыях» (Мінск, 2018). У ім аналізуюцца найбольш значныя дасягненні лінгвістычнай думкі па актуальных напрамках развіцця беларускай мовы, а таксама прыводзяцца асобныя арыгінальныя работы даследчыкаў ХХ ст.

Супрацоўнікі кафедры падтрымліваюць кантакты з навукоўцамі Расіі, Украіны, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Венгрыі і Кітая. У прыватнасці, М. Р. Прыгодзіч удзельнічаў у выкананні міжнароднага праекта «Германізмы ў славянскіх мовах» пад кіраўніцтвам прафесара Альдэнбургскага ўніверсітэта імя Карла фон Асецкага Г. Генчэля. С. М. Запрудскі з'яўляецца членам Камісіі па славянскіх літаратурных мовах пры Міжнародным камітэце славістаў, сфарміраванай з прадстаўнікоў універсітэтаў розных славянскіх і неславянскіх краін. Іншамоўныя запазычанні сталі тэмай навуковага даклада М. Р. Прыгодзіча «Германізмы ў старабеларускай мове на фоне старапольскай мовы» на XVI Міжнародным з'ездзе славістаў (Бялград, 19–27 жніўня 2018 г.) у межах тэматычнага блока, прысвечанага германізмам ва ўсходнеславянскіх мовах[2].

У пачатку ХХІ ст. праблемы нормы і пытанні функцыянавання беларускай літаратурнай мовы набылі асаблівую актуальнасць, што абумоўлена ў першую чаргу звужэннем сферы выкарыстання нацыянальнай мовы ў грамадстве і, адпаведна, пашырэннем сферы ўжывання рускай мовы як адной з дзяржаўных моў. Паміж літаратурнай нормай і фактамі рэальнага выкарыстання мовы заўсёды існуюць разыходжанні: падчас моўнай эвалюцыі норма рухаецца і дапускае ў сваіх межах варыянты, галоўным чынам у вуснай форме маўлення. Вывучэнне сучаснай беларускай літаратурнай мовы на ўсіх узроўнях мае вялікае грамадска-практычнае значэнне, у тым ліку для станаўлення і засваення яе норм. Паняцце нормы з'яўляецца дамінантным у вызначэнні літаратурнай мовы, аднак норму нельга разумець як нязменнае правіла. Беларуская літаратурная мова не выключае ў асобных выпадках варыянтаў, якія адлюстроўваюць змены, што адбываюцца ў ёй як у сродку чалавечых зносін.

У працэсе выканання навукова-даследчай тэмы «Лексіка-семантычны, структурна-граматычны і камунікатыўны аспекты даследавання сучаснай беларускай мовы» былі прааналізаваны праблемы кадыфікацыі лексічнага саставу сучаснай беларускай літаратурнай мовы з пункту гледжання яе нарматыўнасці на ўзроўнях фанетыкі, арфаэпіі, графікі і арфаграфіі[3], марфемікі і словаўтварэння[4], марфалогіі[5] і сінтаксісу[6], вызначаны прыярытэтныя напрамкі далейшага развіцця беларускай мовы ва ўмовах сусветнай глабалізацыі[7]. У лінгвістыцы назапашана вялікая колькасць фундаментальных апісанняў беларускай мовы (акадэмічныя граматыкі і асобныя раздзелы, энцыклапедычныя даведнікі, дысертацыі па прыватных праблемах айчыннага мовазнаўства, мноства навуковых артыкулаў). Супрацоўнікамі кафедры зроблена дастаткова для таго, каб абагульніць сабраныя даныя на падставе адзінай канцэпцыі і падрыхтаваць курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы, даступны па змесце ў першую чаргу студэнту-філолагу, а таксама ўсім, хто мае дачыненне да беларускай мовы і яе тэарэтычнага асэнсавання. Так, праведзена вывучэнне фактычнага матэрыялу па тэме даследавання, а таксама аналіз найноўшай навуковай літаратуры па праблемах лексічнага саставу і функцыянальных стыляў беларускай мовы на працягу яе гісторыі, падрыхтаваны рэестр навуковых публікацый па пытаннях станаўлення і развіцця беларускай мовы ў пачатку – сярэдзіне ХХ ст., апрацавана картатэка індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў з твораў беларускіх пісьменнікаў ХХ–ХХІ стст.

Выканаўцамі навукова-даследчай тэмы «Структура і функцыі беларускай мовы ў ХХ стагоддзі: сінхронны і дыяхронны аспекты» былі складзены выданні, прысвечаныя функцыянальнаму статусу германізмаў[8] і паланізмаў[9] у старабеларускай і сучаснай беларускай мовах, аўтарскай неалагізацыі

[2]Падрабязней гл.: *Прыгодзіч М. Р.* Германізмы ў старабеларускай мове на фоне старапольскай мовы і іх адлюстраванне ў стараўкраінскай і старарускай мовах // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. 2022. № 1. С. 30–39.

[3]*Чахоўская Т. Л., Чахоўскі Г. К.* Сучасная беларуская мова. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія : вучэб.-метад. дапам. Мінск : БДУ, 2017. 247 с.

[4]*Бадзевіч З. І., Русак В. П.* Сучасная беларуская мова. Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне : вучэб.-метад. дапам. Мінск : БДУ, 2017. 227 с.

[5]Сучасная беларуская мова. Марфалогія : дапаможнік / З. І. Бадзевіч [і інш.]. Мінск : БДУ, 2018. 323 с.

[6]*Рамза Т. Р.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс : вучэб. дапам. Мінск : БДУ, 2020. 199 с.

[7]*Рамза Т. Р.* Городские белорусскоязычные: новый путь от «точки невозврата»? // Philologica Slavica Vindobonensia. Bd. 5. Berlin : Peter Lang, 2019. S. 193–204.

[8]Германізмы ў беларускай мове / склад.: А. А. Прыгодзіч, М. Р. Прыгодзіч, Г. Генчэль ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. Мінск : БДУ, 2015. 303 с.

[9]*Свістунова М. І.* Вывучэнне паланізмаў у беларускім мовазнаўстве і стаўленне да іх (XIX ст. – 1930-я гг.) // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. 2017. № 2. С. 39–49 ; *Прыгодзіч М. Р.* Жылі ў адным доме // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі : зб. арт. / пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. Мінск : БДУ, 2016. С. 168–172 (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 37) ; *Ён жа.* Польская мова як пасярэдніца запазычвання слоў нямецкага паходжання ў помніках старабеларускага пісьменства (папярэднія заўвагі) // Там жа. Мінск : БДУ, 2016. С. 25–26 (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 37).

як спосабу папаўнення лексічнага саставу сучаснай беларускай літаратурнай мовы[10]. Яны разглядалі запазычаную лексіку пачатку XXI ст., вызначалі асаблівасці адаптацыі англаамерыканізмаў у беларускай мове[11], даследавалі вядомыя на сённяшні дзень беларускамоўныя тэксты XVIII ст., напісаныя кірыліцай, шукалі новыя тэксты і сістэматызавалі іх, збіралі і вывучалі адпаведную інфармацыю. На падставе аналізу навуковай літаратуры, лексікаграфічнай апрацоўкі тэрмінаў была сфарміравана стратэгія перакладу лексічных адзінак для стварэння беларускамоўнай часткі руска-беларускага слоўніка тэрміналогіі выбарчага права. Зараз завяршаецца падрыхтоўка рукапісу гэтага слоўніка.

Сёння выканаўцы названых вышэй навукова-даследчых тэм працягваюць работу па збору матэрыялу для слоўніка наватвораў Цішкі Гартнага (укладаюць рэестр, публікуюць фрагменты слоўніка), перыядызацыі гісторыі беларускай літаратурнай мовы і вырашэнні праблемы пераемнасці паміж старым і новым перыядамі, кагнітыўнай арыентацыі даследаванняў лексічнага, фразеалагічнага і парэміялагічнага фондаў, лексічнай і фразеалагічнай семантыкі (аналізуюць кагнітыўны аспект формы моўнага знака, нацыянальна-спецыфічныя кагнітыўныя дамінанты ў лексіцы і фразеалогіі беларускай мовы, кагнітыўны патэнцыял беларускай лексікі, фразеалогіі і парэміялогіі розных семантычных палёў, лексіка-семантычных і тэматычных груп), апісанні марфалагічных асаблівасцей сучаснай беларускай мовы зыходзячы з функцыянальна-семантычнага падыходу, актуалізацыі лексічных і граматычных адметнасцей, якія выклікаюць найбольшую цяжкасць пры навучанні беларускай мове іншафонаў і яе засваенні, а таксама па падрыхтоўцы рукапісаў слоўніка старабеларускай мовы, тлумачальнага энцыклапедычнага слоўніка беларускага мовазнаўства і інш. У іх публікацыях знайшлі адлюстраванне пытанні першапачатковага фарміравання заканадаўчага стылю беларускай мовы на працягу XX – пачатку XXI ст.[12] і выпрацоўкі адметных для яго структурных і найперш лексіка-граматычных сродкаў, праблемы адэкватнай перадачы правазнаўчых тэрмінаў з рускай мовы на беларускую і наадварот[13]. Супрацоўнікамі кафедры створаны новыя вучэбна-метадычныя дапаможнікі па гістарычнай фанетыцы[14] і марфалогіі[15] беларускай мовы, а таксама па гісторыі беларускага мовазнаўства[16], хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы[17] і сучаснай беларускай мовы[18], зборнікі выбраных навуковых прац вядомых лінгвістаў у межах серыі «Замежная беларусістыка»[19].

Дацэнтам А. Л. Садоўскай распрацавана методыка вывучэння фразеалогіі як каштоўнага элемента гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа, які мае высокі лінгвакраіназнаўчы патэнцыял і рэпрэзентуе непарыўную сувязь мовы, культуры і грамадства. Праведзена этналінгвістычнае даследаванне вылучанага корпуса фразеалагізмаў і прыказак, якія сваім зместам, лексіка-семантычным складам або прататыпамі адлюстроўваюць факты і падзеі айчыннай гісторыі і культуры. У выніку выяўлены атрыбутыўны каларатыўны код у беларускай фразеалогіі і прасочана яго сувязь з этнакультурай народа, вызначаны і апісаны асаблівасці функцыянавання лексем-каларонімаў у фразеалагічным кантэксце і іх нацыянальна-культурныя канатацыі, устаноўлена спецыфіка кампаратыўных каларатыўных словазлучэнняў як моўнага сродку канцэптуалізацыі і катэгарызацыі рэчаіснасці[20].

Асноўныя вынікі навукова-даследчай тэмы «Беларуская мова на розных этапах яе гістарычнага развіцця: структурна-граматычны, семантыка-стылістычны і нарматыўна-камунікатыўны аспекты» адлюстраваны ў 198 навуковых і навукова-метадычных публікацыях, у тым ліку ў 6 асобных выданнях. Па праблематыцы тэмы былі праведзены IX Міжнародная навуковая канферэнцыя «Мова – літаратура –

[10]*Прыгодзіч М. Р.* Аўтарская неалагізацыя ў беларускай мове : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2021. 175 с.

[11]*Савасцюк М. Л.* Англіцызмы беларускай мовы : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2019. 391 с.

[12]*Кулеш Г. І.* Нацыянальныя адметнасці мовы заканадаўчых тэкстаў // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі : зб. арт. / пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. Мінск : БДУ, 2016. С. 134–142 (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 37) ; *Яна ж.* Выкарыстанне беларускай мовы ў юрыдычнай сферы ва ўмовах білінгвізму // Мова – літаратура – культура : матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф. (Мінск, 15–16 вер. 2016 г.) : у 2 ч. Ч. 1. Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2016. С. 153–158.

[13]*Кулеш Г. І.* Культура прафесійнага маўлення юрыста : вучэб.-метад. дапам. Мінск : БДУ, 2019. 183 с.

[14]*Свістунова М. І., Ціванова Г. К.* Гістарычная фанетыка беларускай мовы : вучэб. дапам. Мінск : БДУ, 2016. 159 с.

[15]*Свістунова М. І., Ціванова Г. К.* Гістарычная марфалогія беларускай мовы : вучэб. дапам. Мінск : БДУ, 2018. 199 с.

[16]*Запрудскі С. М.* Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941) : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2015. 191 с.

[17]*Кулеш Г. І., Свістунова М. І.* Гісторыя беларускай мовы. Хрэстаматыя : вучэб. дапам. Мінск : БДУ, 2022. 231 с.

[18]Сучасная беларуская мова. Хрэстаматыя : дапаможнік : у 2 ч. Ч. 1. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне. Марфалогія / склад.: А. Л. Садоўская [і інш.]. Мінск : БДУ, 2022. 319 с.

[19]*Бідэр Г.* Выбраныя працы па беларускім мовазнаўстве / склад.: А. А. Прыгодзіч, М. Р. Прыгодзіч ; пад агул. рэд. М. Р. Прыгодзіча, Г. Генчэля. Мінск : БДУ, 2021. 223 с. (Замежная беларусістыка) ; *Колер Г.-Б.* Выбраныя працы па беларускім літаратуразнаўстве / склад. П. І. Навуменка ; пад агул. рэд. П. І. Навуменкі. Мінск : БДУ, 2021. 418 с. (Замежная беларусістыка) ; *Піўтарак Р.* Выбраныя працы па беларускім мовазнаўстве / склад.: І. І. Караткевіч, М. Р. Прыгодзіч, А. І. Скапненка ; пад агул. рэд. М. Р. Прыгодзіча. Мінск : БДУ, 2022. 221 с. (Замежная беларусістыка).

[20]*Садоўская А. Л., Садоўская Г. Д., Жызнеўская В. М.* Беларуская этналінгвістыка: аспекты даследаванняў : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2021. 159 с.

культура»[21] і III Міжнародная навуковая канферэнцыя «Пісьменнік – мова – стыль»[22], навуковыя чытанні, прысвечаныя прафесарам В. П. Краснею[23], Л. А. Антанюк[24] і Л. І. Бураку[25], дацэнту І. М. Шчарбаковай[26]. Вынікі і назіранні навуковага даследавання былі выкарыстаны пры стварэнні манаграфій, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў пад грыфам вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама пры распрацоўцы новых вучэбных праграм па актуальных праблемах беларускага і славянскага мовазнаўства, падручнікаў па беларускай мове для агульнаадукацыйных школ і спецыялізаваных устаноў гуманітарнага профілю.

Атрыманыя вынікі маюць значэнне для тэарэтычнага мовазнаўства, практыкі выкладання сучаснай беларускай мовы, стылістыкі і культуры маўлення, лінгвістыкі тэксту, мастацкага аналізу тэксту. Яны могуць быць карыснымі пры стварэнні базавых вучэбных дапаможнікаў па сучаснай беларускай мове для ўстаноў вышэйшай і агульнай сярэдняй адукацыі, распрацоўцы айчыннай лексікаграфіі, аўтарскіх спецкурсаў і спецсемінараў. Акрамя таго, дадзеныя вынікі прадстаўляюць інтарэс для славістаў, замежных навучэнцаў, выкладчыкаў беларускай мовы, супрацоўнікаў інстытутаў павышэння кваліфікацыі, выдавецтваў, рэдакцый і г. д. На кафедры рэгулярна абмяркоўваецца стан навукова-даследчай работы, пры гэтым заслухоўваюцца справаздачы асобных выканаўцаў, ацэньваюцца дасягненні і перспектывы навуковай дзейнасці, рыхтуюцца дысертацыі, вучэбныя дапаможнікі і інш.

## Заключэнне

Праведзеныя супрацоўнікамі кафедры даследаванні дазволілі дэталёва прааналізаваць працэсы станаўлення і папаўнення лексічнага саставу сучаснай беларускай літаратурнай мовы на працягу ХХ – пачатку ХХІ ст., вызначыць месца і ролю індывідуальна-аўтарскай неалагізацыі ў словаўтваральнай сістэме беларускай мовы, ахарактарызаваць структурна-граматычныя, марфалагічныя і семантыка-стылістычныя змены ў беларускай мове на мяжы тысячагоддзяў. Упершыню ў гісторыі айчыннага мовазнаўства адбылося ўсебаковае вывучэнне працэсаў станаўлення заканадаўча-прававога стылю беларускай мовы ад пачатковага этапу яго фарміравання (1920-я гг.) да сённяшняга часу.

Гэтыя назіранні знойдуць выкарыстанне ў межах тэарэтычнага мовазнаўства, практыкі выкладання розных вучэбных дысцыплін, а таксама пры стварэнні базавых вучэбных дапаможнікаў для ўстаноў вышэйшай і агульнай сярэдняй адукацыі, распрацоўцы айчыннай лексікаграфіі, аўтарскіх спецкурсаў і спецсемінараў. Яны могуць быць карыснымі для славістаў і замежных навучэнцаў, выкладчыкаў беларускай мовы, супрацоўнікаў інстытутаў павышэння кваліфікацыі, выдавецтваў, рэдакцый і г. д.

Высокі навуковы патэнцыял кафедры дазваляе праводзіць даследчую работу на адпаведным узроўні. Перспектыўнымі напрамкамі навуковай працы кафедры ў бліжэйшы час стануць даследаванне асаблівасцей сінтаксісу і марфалагічнага ладу асобных помнікаў пісьменства, вывучэнне спецыфікі станаўлення і развіцця беларускай навуковай тэрміналогіі на працягу ХХ – пачатку ХХІ ст., аналіз лексічных інавацый у мове сучаснай мастацкай літаратуры, разгляд іншамоўных запазычанняў у беларускай мове на мяжы тысячагоддзяў і падрыхтоўка спецыялістаў у галіне беларускага кітабазнаўства.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 27.05.2024.*
*Received by editorial board 27.05.2024.*

[21]Мова – літаратура – культура : матэрыялы IX Міжнар. навук. канф. памяці праф. А. Я. Міхневіча (Мінск, 15–16 кастр. 2020 г.) / рэдкал.: А. А. Радзевіч (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2020. 297 с.

[22]Пісьменнік – мова – стыль : матэрыялы III Міжнар. навук. канф., прысвеч. праф. Ц. П. Ломцеву (Мінск, 21–22 верас. 2023 г.) / рэдкал.: М. І. Свістунова (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2023. 565 с.

[23]Беларускае слова: тэрмін і вобраз : зб. арт. па матэрыялах навук. чытанняў, прысвеч. памяці праф. В. П. Краснея (Мінск, 27 снеж. 2017 г.) / рэдкал.: М. І. Свістунова (адк. рэд.) [і інш.] ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. Мінск : БДУ, 2018. 214 с.

[24]Беларускае слова: тэрміналогія і тэрміназнаўства : зб. арт. па матэрыялах навук. чытанняў, прысвеч. 70-годдзю з дня нараджэння праф. Л. А. Антанюк (Мінск, 26 крас. 2019 г.) / рэдкал.: М. І. Свістунова (адк. рэд.) [і інш.] ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. Мінск : БДУ, 2019. 276 с.

[25]Беларускае слова: марфалогія і сінтаксіс : зб. арт. па матэрыялах Рэсп. навук. чытанняў, прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння праф. Л. І. Бурака (Мінск, 25 лют. 2020 г.) / рэдкал.: А. А. Радзевіч, М. І. Свістунова (адк. рэд.) [і інш.] ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2023. 172 с.

[26]Беларускае слова: на хвалях часу : матэрыялы навук. чытанняў, прысвеч. памяці дац. І. М. Шчарбаковай (Мінск, 23 лют. 2022 г.) / рэдкал.: М. І. Свістунова (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2022. 137 с.